Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 1 (243) | Панядзелак, 9 студзеня 1956 года | Цана 20 кап.

Заўтра—XIX з'езд ЛКСМБ.

Добрыя і выдатныя поспехі ў вучобе — лепшы падарунак студэнтаў з'езду комсамола!

* * *

КОМСАМОЛЕЦ, БУДЗЬ НЕПРЫМІРЫМЫМ ДА НЕДАХОПАЎ!

У сталіцы нашай рэспублікі пачынае сваю работу чарговы, XIX з'езд ЛКСМБ. З'езд—вялікая падзея ў жыцці комсамола, у жыцці усёй моладзі Беларусі. Ён падвядзе вынікі шматграннай дзейнасці комсамола па камуністычнаму выхаванню моладзі, па мабілізацыі яе сіл на выкананне ўказанняў Камуністычнай партыі і урада. З'езд вызначыць новыя задачы комсамольскіх аргашзацый і намеціць шляхі іх ажыццяўлення.

Напярэдадні адкрыцця з'езда хочацца пагаварыць не аб тым вялікім і прыгожым, што зроблена комсамольцамі універсітэта. Аб гэтым ужо гаварылі і пісалі многа. І гэта упаўне зразумела. Комсамол універсітэта мае слаўныя традыцыі, якія памнажаюцца моладдзю з года ў год.

... У жыцці кожнага маладога чалавека, дзяўчыны ёсць дні, якія запамінаюцца на ўсё жыццё. Ім будзе дзень, калі яны, скончыўшы універсітэт, стануць на самастойны шлях. Ззаду застануцца вясёлыя, напоўненыя напружанай вучобай дні. Маладыя біёлагі, літаратары, фізікі, гісторыкі, хімікі, матэматыкі пойдуць на свой першы самастойны ўрок і пачнуць сваю складаную цяжкую, але ганаровую працу: выхаванне чалавека.

Выхоўваць чалавека! Што можа быць больш прыгажэйшым за гэтую працу?! Але каб стаць сапраўдным, поўнацэнным педагогам, каб заваяваць сабе з першых дзён дзелавы аўтарытэт у калектыве, мала атрымаць дыплом і накіраванне на работу. Трэба валодаць усімі лепшымі якасцямі совецкага педагога—працавітасцю, скромнасцю, высокай культурай. Усё гэта не прыходзіць само па сабе. Тут, за універсітэцкім сталом, трэба выхоўваць у сабе гэтыя неабходныя якасці.

Але часамі бывае, калі малады чалавек або дзяўчына памыляюцца, не зусім правільна разумеюць як трэба выхоўваць сябе. Гэта часта прыводзіць да таго, што чалавек, бачачы перад сабой пэўную мэту, імкнецца да яе ўсімі сіламі сваёй душы, але зусім не заўважае і не звяртае ўвагі на так званыя «дробязі» у сваіх паводзінах, на якія не прывыклі звяртаць увагі і якія шмат непрыемнасцей часамі прыносяць нам.

Вось перад намі не так даўно адрамантаваная аудыторыя. Паркетная падлога, афарбаваныя сталы. А на сталах надпісы: «Люблю до безумия». А побач прыпісана, але ўжо іншай рукой: «Каго? Напішыце».

Якіх толькі надпісаў няма! Зайдзіце ў любую аудыторыю універсітэта і вы абавязкова на сталах знойдзеце ўсемагчымыя запісы.

Паўстае законнае пытанне—ці змогуць аўтары гэтых запісаў у будучай сваёй працы навучыць дзяцей берагчы школьную маёмасць, шанаваць сацыялістычную ўласнасць? Думаецца, што не. Выклікае здзіўленне, што ў комсамольскіх групах не звяртаюць на гэта ўвагі. А аб гэтым трэба пагаварыць на сходах у групах, і пагаварыць вельмі сур'ёзна.

Можна назваць многа розных учынкаў, што на першы погляд здаюцца нязначнымі, якія робяць нашы студэнты. І, як правіла, у нас не звяртаюць на гэта ўвагі. Лічаць дробязямі, баяцца і саромяцца аб гэтым гаварыць.

Студэнт III курса фізмата А. Зыль не лічыць для сябе непрыстойным выкурыць папяросу ў аудыторыі. Б. Савіцкі (IV курс філфака) можа пайсці у любы час з лекцыі, падмануушы пры гэтым выкладчыка. Нягледзячы на тое, што у вучэбным корпусе біяфака цёпла, можна заусёды бачыць А. Котаву і Б. Трусевіч (III курс аддзялення журналістыкі) у верхняй вопратцы.

Чаму-ж на ўсе гэтыя непаразумені, расхлябанасць, неахайнасць, якія засмучаюць усё прыгожае, не звяртаюць увагі у нашым калектыве? Ці гэта дробязі?

Паводзіны студэнта ва універсітэце ў многім вызначаюць яго будучыя педагагічныя поспехі. Але тым не менш многія разважаюць так: вось скончым універсітэт, тады і пачнем жыць па-іншаму, па-даросламу. Гэтыя таварышы забываюць, што на першы погляд дробныя адмоўныя учынкі ператвараюцца ў звычкі, ад якіх пасля цяжка пазбавіцца. Тут асабліва патрэбна дапамога комсамольскага калектыву, які-б у час змог-бы аказаць уплыў на чалавека, каб хутчэй пазбавіць яго ад дурных звычак, пакуль яшчэ яны трывала не ўвайшлі ў яго жыццё.

Нішто не павінна праходзіць міма поля зроку комсамола. Нехай нават спазненне на лекцыю, грубасць ва ўзаемаадносінах з таварышам, несумленнасць або падхалімства...—кожная, здавалася-б на першы погляд, «дробязь», стане прадметам абмеркавання калектыву.

Напярэдадні адкрыцця з'езда комсамола хочацца яшчэ раз сказаць у голас: комсамолец, не праходзь міма нават самых нязначных фактаў дрэнных паводзін студэнтаў. Лічы сваім абавязкам быць непрымірымым да гэтых «дробязей», прынцыповым у іх выкараненні.

ДОБРЫЯ ВЫНІКІ

Хоць і добра ведаеш той ці іншы прадмет, але ўсё-ж перад залікамі або экзаменамі хвалюешся. А што, калі не зможаш адказаць на усе пытанні выкладчыка?

Студэнтка V курса аддзялення біялогіі Чаранкевіч вельмі любіла «Параўнальную анатомію пазванковых». І ведала яна яе нядрэнна. Але усё-ж, калі ішла на залік, неяк хвалявалася. Здавалася, што яна нічога не ведае. А вось і атрымала пытанне: «Асноўныя накіраванні філагенетычнага формаутварэння і роля умоў знешняга асяроддзя». На гэтае пытанне і на усе іншыя яна адказала без затрымкі, поўна і зразумела.

Прымаушы залікі кандыдат біялагічных навук Г. В. Гладкі адзначыў выдатныя веды студэнткі.

Не горш адказала і яе сяброўка Макарэвіч. Яна адказвала на пытанне аб вучэнні А. Н. Северцава аб філэмбрыягенезах.

А вось тым, хто не займаўся цэлы семестр, цяжка прышлося на заліках. Студэнткі Жалнерчык і Хацько не маглі адказаць нават на самыя простыя пытанні накшталт «Паходжанне пяціпалай канечнасці».

Добра прайшлі першыя залікі ў батанікаў пятага курса. Яны здавалі «Выбраныя радзелы па анатоміі раслін» і «Фітапаталогію». Гэтыя залікі паказалі, што большасць пяцікурснікаў добра засвоіла пройдзены матэрыял, што яны ужо зараз рыхтуюцца да дзяржаўных экзаменаў.

І. СІПАКОЎ.

* * *

Трэці дзень студэнты-філолагі здаюць залік па зарубежнай літаратуры XVII—XVIII ст. Трэба адзначыць, што слаба падрыхтаванымі да заліку аказаліся студэнты Дуброўская, Шукан, Дауціна,

У той-жа час многія студэнты: Барадулін, Грыц, Слагада, Мішурная, Левіна, Кітаева, Жураўлёва, Лушчыцкая паказалі глыбокія веды па пройдзенаму матэрыялу.

Д. ЕЛІСЕЕЎ.

ІДУЦЬ ЗАЛІКІ

Амаль на усіх факультэтах універсітэта ідуць залікі. Сотні будучых спецыялістаў даюць справаздачу аб сваёй працы на працягу першага семестра. Залік—гэта такое-ж сур'ёзнае выпрабаванне, як і экзамен. І вытрымаць яго трэба таксама з гонарам.

На гэтай старонцы мы змяшчаем матэрыялы, у якіх паведамляецца аб тым, як ідуць залікі на факультэтах.

ПАЧАТАК ЗРОБЛЕНЫ

Галя хвалявалася. Ды чаму-б ёй не хвалявацца: сёння яна павінна, як і іншыя першакурснікі гістфака, здаць першы у сваім студэнцкім жыцці залік—па лацінскай мове.

Увесь семестр Галя рэгулярна завучвала словы, фразеалагічныя звароты, вывучала граматычныя правілы. Заусёды рыхтавалася да практычных заняткаў. І вось першая праверка накопленых ведаў...

Разам з аднакурснікам Феліксам Налівайка Галя Габрынец заходзіць у аудыторыю. Выкладчык лацінскай мовы Фёдар Макаравіч Нечай просіць іх запісаць і абдумаць пытанні.

Праз некалькі мінут Фелікс пачынае адказваць. Яго голас гучыць упэўнена, спакойна: студэнт добра ведае пройдзены матэрыял.

— А зараз давайце, калі ласка, пагутарым з вамі,—звяртаючыся да Г. Габрынец, гаворыць Фёдар Макаравіч, калі Фелікс Налівайка, атрымаушы «залічана» радасны і вясёлы выйшаў з аудыторыі.

Хто са студэнтаў не адчувае хвалюючых мінут чакання адказу на заліках і экзаменах, калі твой таварыш - аднакурснік атрымоувае заліковую кніжку, і ты восьвось сядзеш супраць экзаменатара? Затым—спакой, ты адчуваеш, што зможаш адказаць на кожнае пытанне. Так было і з Галяй.

Яна спакойна села побач з экзаменатарам, дакладна і упэўнена адказвала на усе пытанні.

— Давайце вашу заліковую кніжку,—сказаў Фёдар Макаравіч і паставіў у яшчэ зусім чыстую заліковую кніжку Галіны Габрынец першы залік.

Б. САЧАНКА,
В. ЖУКАВЕЦ.

Журналісты павінны больш пісаць

Адпаведна з новым вучэбным планам курс «Друк зарубежных комуністычных і рабочых партый» лічыцца важнай дысцыплінай у сістэме падрыхтоукі журналістаў. Кафедра зарубежнай літаратуры прапануе студэнтам перад залікам па гэтаму курсу зрабіць агляд аднаго з перыядычных выданняў.

Аднак у гэтым годзе выкананне гэтага агляду сустрэла некаторыя цяжкасці.

Актыу курса прыняуся схіляць нам: дэкана філфака да таго, каб не прадстауляць да заліка пісьмовыя работы—агляды друку. І у той час, як студэнты В. Чаргейка, В. Зарэцкі, А. Мальдзіс, А. Чаркасаў, Т. Крачкоўская, Е. Крыскавец прадставілі змястоўныя агляды польскіх, кітайскіх, румынскіх, германскіх перыядычных выданняў, рад студэнтаў: Н. Акуліч, Л. Глебка, І. Афанасьеў, Г. Карлава напісалі павярхоўныя, слабыя работы, якія ніяк не сведчаць ні аб начытанасці, ні аб прафесінай хватцы. А выпускнік аддзялення журналістыкі А. Касцючэнка напісау агляд з грубейшымі арфаграфічнымі памылкамі.

Вынік з гэтай гісторыі адзіны — студэнт-журналіст павінен больш пісаць, асабліва аглядаў друку.

Д. Е. ФАКТАРОВІЧ,

НАШЫ ПАЖАДАННІ

Нам, выпускнікам універсітэта, хочацца сказаць некалькі слоў у адрас нашай агульнаўніверсітэцкай і факультэцкай комсамольскіх арганізацый, бо нам, як нікому, лепш відаць, наколькі узровень работы комсамольскай арганізацыі адстае ад патрабаванняў жыцця, ад задач, пастаўленых XVIII з'ездам комсамола Беларусі.

Комсамольская арганізацыя універсітэта замкнулася ў вузкім кругу асобных пытанняў. Комсамольскія актывісты не лічаць сваім абавязкам асабіста бываць у інтэрнатах, практычна вырашаць некаторыя пытанні паляпшэння культурна-бытавых умоў студэнтаў. Не звяртаюць належнай увагі на палітыка-выхаваўчую і культурна-масавую работу сярод студэнтаў, што пражываюць у інтэрнаце: на праводзяць лекцыі, дакладау, гутарак, вечароў адпачынку, канферэнцый чытачоў, калектыўнае наведванне кіно, тэатраў, музеяў, выставак. За пяць гадоў вучобы ва універсітэце ў нас не было ніводнага калектыўнага наведвання Дома тэхнікі, будаунічай выстаўкі, навукова-тэхнічных кінофільмаў.

Нельга прызнаць правільным і той факт, што камітэт комсамола універсітэта мала цікавіцца, як абслугоўваюць студэнтаў сталовыя грамадскага харчавання, буфеты, пашывачныя і рамонтная майстэрні.

Галоунай нашай задачай з'яуляюцца сумленныя адносіны да працы, як да абавязку і першай неабходнасці кожнага совецкага чалавека.

Але ў нас бываюць частыя выпадкі, калі некаторыя комсамольцы адмаўляюцца ехаць працаваць у веску, сядзяць за шырокай спіной сваіх бацькоў дома, у Мінску, нідзе не працуючы.

Комсамольская арганізацыя павінна настойліва прывіваць моладзі высокія маральныя якасці, выхоўваць адказнасць за свае учынкі, весці непрымірымую барацьбу з п'янствам, хуліганствам, злачынствам, выхоўваць у юнакоў таварыскія адносіны да дзяўчыны, вернасць у дружбе, павагу да старэйшых.

Нам чужы паразітычны вобраз жыцця, як і людзі, заражоныя парокамі мінулага, з модным прычоскамі і крыклівай знешнасцю.

Наш студэнт павінен быць перш за усё скромным, якім быу стваральнік Саюза моладзі В. І. Ленін.

З. МАНЬКО,
Н. ВЯДЗЁРЧЫК,
студэнткі V курса аддзялення фізікі.

Новагодні вечар

І вось зноў прынес Новы год у спартыўную залу хімкорпуса весялосць, гаманлівасць, святочнасць. Пераліваецца залацістымі агнямі ёлка, над галовамі павіслі падаючыя сняжынкі, пад ёлкай таксама іскрыцца снег, і зала нагадвае сваім убраннем светлую новагоднюю ноч. Здаецца, што сюды сапрауды пранікла нейкім загадкавым чынам зіма. Кружацца у танцах юнакі і дзяўчаты. Ва усіх—радасныя, шчаслівыя твары, на вуснах—вясёлыя усмешкі...

У 12 гадзін у залу з'явіуся і сам дзед-Мароз. Да позняй ночы весялілася моладзь... Ні на мінуту не змаукалі мелодыі музыкі, пералівы песень, радасны і вясёлы смех...

І. ШКЛОЎСКІ,
Б. ПАЛЯШУК.

ІДЭЙНАЕ ВЫХАВАННЕ — ВОСЬ ГАЛОЎНАЕ

5 студзеня адбыуся адкрыты партыйны сход партарганізацыі універсітэта. З дакладам «Аб стане палітыка-выхаваучай работы» выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. Малышау. Прысуткічаушыя на сходзе комуністы, комсамольскія і профсаюзныя актывісты выступілі у спрэчках, унеслі рад дзелавых, канкрэтных прапаноу, накіраваных на паляпшэнне палітыка-выхаваучай работы.

УЗМАЦНІЦЬ ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ

(З даклада прарэктара па вучэбнай рабоце т. Малышава)

Падрыхтоука спецыялістау у вышэйшых навучальных установах і іх комуністычнае выхаванне,—гаворыць дакладчык,—складаная і адказная справа, якая не церпіць коснасці і руціны, роунадушша і фармалізма. Прамая задача партыйных, профсаюзных і комсамольскіх арганізацый, абавязак кожнага навуковага работніка—дапамагчы студэнту зразумець значэнне і важнасць задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, выхоуваць у яго пачуцці адказнасці і дзяржаунага абавязку за авалоданне ведамі, свядомых адносін да вучэбнай дысцыпліны.

Нельга сказаць, што нашы грамадскія арганізацыі не удзяляюць гэтаму пытанню увагі. Тым не менш стан палітыка-выхаваучай работы ва універсітэце далёка не адпавядае патрабаванням, якія прад'яуляюцца да нас партыяй і урадам. Аб гэтым сведчыць рад фактау праяулення сярод студэнтау чужых нашаму грамадству норавау і настрояу, разгільдзяйства, амаральных паводзін, індывідуалізма, зняважлівых адносін да калектыву.

Сістэматычна, з месяца у месяц, расце колькасць пропускау вучэбных заняткау. Калі у верасні бягучага года без уважлівых прычын было прапушчана 1427 вучэбных гадзін, то у лістападзе гэтая лічба павялічылася да 4488 вучэбных гадзін. Прычым гэтыя даныя далёка няпоуна адлюстроуваюць сапраўднае становішча спраy: многія старасты груп не заусёды адзначаюць адсутнічаючых. Напрыклад, старасты IV курса аддзялення журналістыкі Лабада і Шолахау 15 студзеня не адзначылі 15 чалавек, што адсутнічалі на лекцыі па палітэканоміі. Асабліва трывожнае становішча у гэтых адносінах на юрыдычным, гістарычным і геолага-геаграфічным факультэтах. Там на кожнага студэнта у сярэднім даводзіцца 2—2,5 гадзіны пропускау заняткаy.

З году у год расце колькасць амаральных учынкаy. За прайшоушы перыяд бягучага навучальнага года з універсітэта выключана 10 студэнтаy, якія сваімі паводзінамі зневажалі не толькі званне совецкага студэнта, але гонар усяго калектыву універсітэта. Маюць месца факты хуліганскіх зрывау лекцый і практычных заняткаy, спробы ашукаць выкладчыка на экзамене, паяуленне у нецвярозым выглядзе у інтэрнатах, вучэбных карпусах, нядбайныя адносіны да вучэбнага інвентара і абсталявання і г. д.

Адной з праяу грубай недысцыплінаванасці раду студэнтаy з'яуляецца акадэмічная запазычанасць па экзаменах і заліках. Да апошняга часу яшчэ 17 студэнтаy не ліквідавалі сваю акадэмічную запазычанасць па выніках веснавой сесіі.

Усё гэта сведчыць аб тым, што нашы партыйныя і грамадскія арганізацыі, нашы прафесары і выкладчыкі вельмі мала удзяляюць увагі выхаванню у студэнтаy сацыялістычных адносін да працы, дастойных паводзін у быце, праходзяць міма фактаy недысцыплінаванасці.

Зусім ухілілася ад правядзення выхаваучай работы са студэнтамі асноуная маса замацаваных за групамі выкладчыкаy. Уся гэтая работа звялася да пустой фармальнасці. Многія выкладчыкі адарвалися ад сваіх груп, не наведваюць студэнцкія вечары і сходы, вельмі рэдкімі гасцямі бываюць у студэнцкіх інтэрнатах. Безадказна адносяцца да даручаных абавязкаy дацэнты тт. Тутаеу, Ламбін, Касоускі, выкладчыкі тт. Крыучык, Шакун, Салун, Кавалёва, Хромава, Вазнячук, Кікаць, асістэнт т. Гіль і інш.

Вельмі вялікае выхаваучае значэнне змястоунай, навукова абгрунтаванай лекцыі, добра пабудаваных семінараy і практычных заняткаy. Між тым асобныя навуковыя работнікі не забяспечваюць высокі узровень выкладання. З боку студэнтаy ёсць сур'ёзная незадаволенасць якасцю лекцый дацэнта Міхайлава, выкладчыка Стадольнік, прафесара Шпірт, дацэнта Самадурава; вельмі дрэнна праводзіць семінары па палітэканоміі асістэнт Чаплінская. Барацьба за якасць лекцый і практычных заняткаy—справа не толькі заг. кафедрамі і дэканау факультэтаy, але і усіх комуністаy.

Ад размоў да справы

(З выступлення сакратара парткома т. Старавойтава)

У апошні час універсітэт стаy вучэбнай установай, вядомай па дрэнных учынках з боку студэнтаy. Таму і не выпадкова, што ён часта фігуруруе у рашэннях вышэйстаячых партыйных органаy у адмоўным сэнсе. Асабліва у гэтых адносінах дрэнна абстаяць справы на юрыдычным факультэце, студэнты якога ведаюць усе законы, якія яны самі і парушаюць.

У чым тут прычына? А прычына у тым, што сярод выкладчыкаy гэтага факультэта адсутнічае надзейная зладжанасць у іх рабоце. Творчую, вострую крытыку тут падмяняюць ананімнымі пісьмамі, якія нярэдка паступаюць у адрас партыйнага камітэта.

Патрабавальнасць да комуністаy тут нізкая, кантроль з боку партыйнай арганізацыі за работай агітатараy у групах зусім адсутнічае.

Нярэдкімі бываюць факты, калі студэнцкія калектывы становяцца на шлях абароны дрэнных учынкаy асобных студэнтаy. Не на вышыні у гэтых адносінах аказаўся і камітэт комсамола універсітэта на чале з яго сакратаром тав. Бабосавым. Замест уздзеяння на разбэшчанасць студэнтаy, комсамольскія кіраунікі аказваюцца ў хвасце і нярэдка ідуць на павадку у іх.

Да сучаснага моманту не усе выкладчыкі уключыліся у выхаваучую работу студэнтаy, не кажучы ужо аб тым, што яны павінны займацца выхаваннем не толькі насельніцтва г. Мінска, а і усёй рэспублікі.

Планы палітыка-выхаваучай работы выконваюцца слаба, асабліва гэта датычыцца юрыдычнага факультэта, дзе сакратар партарганізацыі тав. Матусевіч зусім не мабілізуе выкладчыкаy на правядзенне важнейшых факультэцкіх мерапрыемстваy. Так, напрыклад, на комсамольскі сход факультэта з'явілася толькі два выкладчыкі, якія, бачачы непадрыхтаванасць схода, зусім пакінулі яго замест таго, каб самім прыняць у ім удзел і даць яму правільны напрамак.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што ва універсітэце яшчэ адсутнічае штодзённы кантроль за палітыка-выхаваучай работай сярод студэнтаy, што на многіх факультэтах гэты важнейшы ўчастак работы падмяняюць словамі.

З ПАСТАНОВЫ ПАРТЫЙНАГА СХОДУ

Рашуча палепшыць выхаваучую работу сярод студэнтаy у вольны ад заняткаy час, сканцэнтраваушы асноуную увагу на правядзенне палітыка-выхаваучай работы у акадэмічных групах і інтэрнатах. Устанавіць з гэтай мэтай правядзенне штотыднёвых палітгутарак па пытаннях міжнароднай і унутранай палітыкі, а таксама па пытаннях, звязаных з жыццём факультэта і акадэмічных груп.

Дабіцца выканання правіл унутранага распарадку ў вучэбных памяшканнях і інтэрнатах універсітэта. Намаганнямі усяго калектыву прывіваць студэнтам высокія маральныя якасці, свядомую дысцыпліну, арганізаванасць, неабходныя навыкі і звычкі культурных паводзін. У мэтах узмацнення грамадскага уздзеяння на асобных парушальнікаy вучэбнай дысцыпліны і насіцеляy іншых амаральных учынкаy лічыць мэтазгодным арганізаваць з пачатку другога семестра выпуск агульнауніверсітэцкай сатырычнай газеты.

Партыйны сход абавязвае ўсіх комуністаy і заклікае увесь калектыу навуковых работнікаy узняць узровень усёй вучэбна-выхаваучай і навукова-даследчай работы, арганізаваna правесці зімовую экзаменацыйную сесію з тым, каб дастойна сустрэць XX з'езд КПСС.

У выхаваўчай рабоце няма дробязей

(З выступлення т. Мелкіх)

Праўваюць у студэнцкіх групах вельмі цяжка. Заусёды задумваешся над пытаннем: што трэба рабіць, каб папярэдзіць дысцыпліну, ліквідаваць пропускі заняткаy і г. д. Кіраунику групы неабходна вывучаць кожнага студэнта, знаць яго быт і запатрабаванні. Наведванне інтэрнатаy павінна стаць рэгулярным. Вывучэнне абставін, у якіх жывуць і працуюць студэнты, дапаможа нам у працы.

У палітыка-выхаваучай рабоце няма дробязей. Я перыядычна правяраю канспекты студэнтаy. Гэта дапамагае мне, у першую чаргу, пры падрыхтоуцы да лекцый. Па запісах у канспектах я магу меркаваць аб якасці чытаемых мной лекцый. Гэта абавязвае студэнтаy уважліва слухаць і канспектаваць.

Вельмі важна мець у кожнай групе актыу, на які-б выкладчык мог абапірацца ў сваёй рабоце.

БОЛЬШ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ

(З выступлення т. Нахімоускай)

Задача выкладчыка — прывіць любоу студэнту да вывучаемай дысцыпліны. Таму трэба дабівацца паляпшэння якасці чытаемых лекцый. На фізіка-матэматычным факультэце студэнты не задаволены лекцыямі тав. Міхайлава і іншых выкладчыкаy. Скаргі студэнтаy паутараюцца з году ў год, а на іх усё-ж не звяртаецца ніякай увагі з боку кіруючых таварышаy.

Неабходна павысіць патрабавальнасць да студэнтаy. Мы часта дапускаем пераздачу прадметаy для паляпшэння адзнакі. Гэтыя уступкі звычайна расслабляюць студэнтаy.

«БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»
2 стар. 9 студзеня 1956.

ПРЫСЯКАЦЬ НЕДАСТОЙНЫЯ ПАВОДЗІНЫ

(З выступленя т. Дорскага)

За пасляваенныя гады універсітэт дабіуся значных поспехаy у палітыка-выхаваучай рабоце сярод студэнтаy. Амаль зжыты выпадкі зрыву заняткаy, студэнты палепшылі свае паводзіны.

Аднак, асобныя факты сведчаць аб тым, што намі яшчэ не усё зроблена.

Так, напрыклад, студэнт V курса аддзялення журналістыкі Касцючэнка нагрубіу мне і адмовіуся назваць сваё прозвішча. Студэнт II курса аддзялення журналістыкі Ляпесін абураюча вёу сябе пры напісанні кантрольнай работы.

Многія студэнты да гэтага часу маюць акадэмічную запазычанасць (Саковіч—III курс гістфака), а дэканаты не прымаюць рашучых мер, каб ліквідаваць гэтыя недахопы.

Хочацца сказаць яшчэ вось аб чым. Да гэтага часу ва універсітэце няма спецыяльнага кабінета, дзе-б выкладчыкі замежных моу маглі прымаць унеаудыторнае чытанне. Гэта зніжае якасць вывучэння замежных моу.

Недахопы зжыць

(З выступленя т. Бабосава)

Мы да гэтага часу яшчэ не дабіліся, каб комсамольская група стала сапраудным цэнтрам выхаваучай работы, мала працуем з комсамольскім актывам. Многія комсамольскія групы яшчэ не сталі боездольнымі, моцнымі комсамольскімі арганізацыямі, часта у групе не могуць правільна па-комсамольску прынцыпова паставіць і вырашыць важныя пытанні выхаваучай работы (III курс геафака). У комсамольскіх групах не абмяркоуваюць амаральных учынкаy комсамольцаy, а нярэдка абараняюць тых, хто павінен быць падвергнут рэзкай крытыцы.

Асабліва многа недахопаy у палітыка-выхаваучай рабоце на юрыдычным факультэце. Іменна сярод студэнтаy юрфака мы бачым найбольшую колькасць розных учынкаy і парушэнняy грамадскага парадку. На гэтым-жа факультэце была сарвана падпіска на газеты. Так, з 29 нумароу «Чырвонай змены» выпісана толькі 3, з 25 нумароу «Фізкультурніка Беларусі» — 9.

У групах юрфака дрэнна і рэдка праводзяцца палітінфармацыі. Напрыклад у I групе III курса юрфака кіраўніком дацэнт т. Волкау. За увесь семестр там была праведзена толькі адна палітінфармацыя, але і на ей тав. Волкау не прысутнічау. Такі стан палітыка-выхаваучай работы ў групе і прыводзіць да амаральных учынкаy.

Вось яшчэ факт. Студэнт III курса юрфака Крамнік на лекцыі ударыу дзяучыну. Абураныя комсамольцы патрабавалі скліканне групавога комсамольскага сходу. На сходзе намеснік сакратара комсамольскага бюро факультэта т. Сяргееу і іншыя комсамольцы выступілі з рэзкай крытыкай, аднак у хулігана знайшліся заступнікі і сярод іх комуніст Главіцкая. Яна перарывала выступленні тых комсамольцаy, якія сурова асуджалі Крамніка, і, па сутнасці, сарзала групавы комсамольскі сход. У выніку гэтага хуліганскі учынак Крамніка быу ацэнен як простае парушэнне дысцыпліны на лекцыі.

Гэтыя факты сведчаць аб тым, што комсамольскія групы патрабуюць не толькі кантролю, але, галоунае, дзейснай дапамогі з боку партыйных арганізацый і выкладчыкаy факультэтаy.

НЕЛЬГА МІРЫЦЦА З ФАРМАЛІЗМАМ

(З выступленя т. Палілава)

Адной з прычын слабай палітыка-выхаваучай работы з'яуляецца няпоуны ахоп грамадскімі даручэннямі усіх студэнтаy, пастаяннае паутарэнне адных і тых-жа форм выхаваучай работы.

Многія мерапрыемствы праводзяцца па шаблону, дубліруюцца, што часта прыводзіць да фармалізма. Адсюль вынікае, што работу з моладдзю трэба зрабіць больш рознастайнай, а для гэтага патрэбна больш ініцыятывы.

Нашы партыйныя сходы не заусёды з'яуляюцца сапраўднай школай выхавання, бо не усе комуністы прымаюць актыуны удзел у абмеркаванні пастауленых пытанняy.

На біёлага-глебавым факультэце зроблены некаторыя крокі ў напрамку арганізацыі сумеснай работы грамадскіх арганізацый і дэканата. Вывешан графік пропускаy лекцый і паспяховасці студэнтаy і графік здачы дамашняга чытання па замежных мовах. Такая форма садзейнічае павышэнню паспяховасці і дысцыпліны, уздымае узровень усёй палітыка-выхаваучай работы.

Неабходна звярнуць увагу на фарміраванне ў моладзі свядомай працоунай дысцыпліны. Мы часта знікаем патрабаванні да студэнтаy і гэтым самым ствараем умовы для добрадушша ў адносінах да вучобы і працы. Трэба дабіцца таго, каб экзамены сталі сапраўднай праверкай ведаy студэнтаy, вынікаy іх самастойнай працы над вывучаемым матэрыялам.

ПРЫСЛУХАЦЦА ДА ГОЛАСУ СТУДЭНТАЎ

(З выступленя т. Маханька)

Тав. Палілау заклікаў да барацьбы з лібералізмам, пераконваў не баяцца «троек» і «двоек». Мне здаецца, што гэта правільна. Аб'ектыуна ацэньваць веды студэнтаy—абавязак выкладчыка.

На партыйным сходзе фізмата мяне крытыкавалі за дрэнную работу у замацаванай за мной групе. Гэта прымусіла мяне сур'ёзна падумаць. Да таго-ж, адбыуся такі выпадак. На семінарскія заняткі, якія я праводжу, не з'явілася 10 чалавек. Гэта сур'ёзнае парушэнне вучэбнай дысцыпліны абмяркоувалася на групавым сходзе. Аказалася, што студэнты не былі падрыхтаваны да семінара. Расклад складзен без уліку пажаданняy студэнтаy. А змяніць расклад можна, каб семінарскія заняткі па асновах марксізма-ленінізма перанесці з панядзелка на іншы дзень. Гэта дасць магчымасць студэнтам лепш рыхтавацца.

Не прыслухоуваюцца да голасу студэнтаy на фізмаце. А трэба!

Усесаюзная канферэнцыя па поўправадніках

З 14 па 20 лістапада у Ленінградзе адбывалася Усесаюзная канферэнцыя па поўправадніках. У рабоце канферэнцыі прынялі удзел звыш 1000 работнікаў інстытутаў, заводаў і вышэйшых навучальных установ краіны, таксама удзельнічалі вучоныя краін народнай дэмакратыі — Кітая, Польшчы, Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Было прадстаулена звыш 180 дакладаў, з якіх 138 былі заслуханы і абмеркаваны. Выступілі з дакладамі і навуковыя супрацоўнікі нашага універсітэта.

Дацэнт І. Г. Некрашэвіч прачытаў даклад на тэму «Тэрмамеханічныя з'явы у тонкіх пластах поўправаднікоу», асістэнт І. І. Пятроускі—«Даследаванне генерыруючых крышталаў». Удзельнікамі канферэнцыі былі дацэнт М. К. Шыдлоускі і асістэнт В. А. Путан.

Канферэнцыя з'явілася значнай падзеяй у навуковым жыцці. На ёй прысутнічалі прадстаунікі многіх галін навукі, тэхнікі, многа інжынэрна-тэхнічных работнікаў заводаў, студэнты шматлікіх ленінградскіх ВНУ.

Фізіка поўправаднікоу толькі нядауна аформілася як самастойны і важны раздзел тэарэтычнай і прыкладной навукі, якая вылучылася з фізікі цвёрдага цела.

У дакладах, прачытаных на пленарных пасяджэннях канферэнцыі, а таксама на пасяджэннях секцый, былі вызначаны пытанні фізікі поўправаднікоу, найбольш актуальныя для тэхнікі, былі прадэманстраваны дасягненні навуковых калектываў і асобных вучоных нашай краіны.

Тэхнічнае выкарыстанне поўправаднікоу вельмі шырокае, яно павялічваецца з кожным днём. Калі раней асноуным элементам у аутаматыцы, тэлемеханіцы і радыёапаратуры служыў вакуумны электронны або газаразрадны ённы прыбор, то цяпер усё шырэй ужываюцца электронныя прыборы, зробленыя з невялікіх кавалачкаў поўправадніковых матэрыялаў.

Дзеянне электравакуумных прылад заснавана на магчымасці электрамагнітнага кіравання патокам электронаў і ёнаў, якія рухаюцца унутры сасуда, дзе пакінута толькі невялікая колькасць атамаў або малекул.

Дзеянне поўправадніковых прылад грунтуецца на магчымасці электрамагнітнага кіравання рухам зарадаў унутры цвёрдага цела (поўправадніка). На гэтай аснове і ўзнікла новая поўправадніковая электроніка. З'явіліся электрычныя уласцівасці цвёрдага цела у вельмі шырокіх межах, атрымліваючы спачатку звышчыстыя матэрыялы, а затым уносячы ў іх строга кантралюемую тую або іншую колькасць прымесяў.

Сотыя долі працэнта той або іншай прымесі здольны у сотні тысяч і мільёны разоу змяняць электраправоднасць многіх цвёрдых цел. Дзякуючы гэтаму адкрываецца магчымасць вырабу рэчывау з загадзя заданымі электрычнымі уласцівасцямі, а з другога боку—кантроль за колькасцю прымесяу у чыстых матэрыялах можна ажыццяўляць па іх электрычных уласцівасцях.

Фізічныя з'явы ў кантактах паміж металамі і поўправаднікамі лягли у аснову высокаэканамічных малагабарытных выпрамляльнікаў. Так, выпрамляльнік на 150 вольт і 350 ампер складаецца з тонкай германіевай пласцінкі, зацiснутай паміж двума меднымі дыскамі дыяметрамі усяго каля 6 сантыметрау.

Такія выпрамляльнікі зроблены у лабараторыі поўправаднікоу ЛФТІ, якой кіруе прафесар Д. І. Наследау.

Поўправадніковыя фотаэлементы, дзіоды, трыоды маюць мініятурныя размеры, высокую трывалась і надзвычайна простую канструкцыю. Іх ужыванне у сучаснай радыётэхніцы, у лічыльных машынах дазваляе скараціць размеры гэтых прыбораў у дзесяткі і сотні разоу.

Прымесі некаторых поўправаднікоу да металаў выклікаюць рэзкае змяненне не толькі электрычных, але механічных, аптычных і магнітных уласцівасцей металаў, стараючы тым самым новыя магчымасці для іх тэхнічнага выкарыстання.

Фізічныя даследаванні поўправаднікоу садзейнічаюць разуменню складаных працэсаў, якія адбываюцца ва усіх цвёрдых рэчывах—металах і неметалах, ужываемых у розных галінах сучаснай тэхнікі, якая прад'яўляе усе новыя і новыя патрабаванні да уласцівасцей матэрыялаў.

Усё гэта набывае асаблівае значэнне у сувязі з развіццём ядзернай энергетыкі, рэактыунай тэхнікі, з шырокім укараненнем аутаматыкі.

Канферэнцыя паказала, што многія названыя пытанні інтэнсіўна распрацоўваюцца у нашай краіне. Было ўказана і на тое, што фронт работы у гэтым важным напрамку усё яшчэ недастаткова шырокі, каб задавальняць узрастаючыя запатрабаванні хутка растучай новай тэхнікі.

У рэзалюцыі канферэнцыі намечаны асноўныя напрамкі далейшых навуковых даследаванняў і выказана пажаданне аб прыцягненні да гэтай работы большай колькасці кафедр ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў.

І. Г. НЕКРАШЭВІЧ,
дацэнт.

БАЦЬКОЎСКІЯ КЛОПАТЫ

Для аказання матэрыяльнай дапамогі адчуваючым у гэтым патрэбу студэнтам пастанавай Совета Міністрау СССР і ЦК КПСС прадугледжан дырэктарскі фонд у размеры 0,2 працэнта ад фонду стыпендый, што складае па універсітэту каля 30 тыс. рублёу у год.

Пятнаццаці студэнтам універсітэта нядауна аказана грашовая дапамога з фонда Вярхоунага Совета БССР у размеры ад 300 да 500 рублёу кожнаму.

Студэнты, у якіх бацькі загінулі у час Вялікай Айчыннай вайны або з'яуляюцца непрацаздольнымі, атрымалі грашовую дапамогу для пакупкі зімняга адзення, для лячэння.

Быць выбраным комсамольскім важаком—вялікае давер'е таварышаў, давер'е якое ты павінен апраудаць. Ты не маеш права ашукаць надзеі,ускладзеныя на цябе, тваімі таварышамі-комсамольцамі. Ад цябе чакаюць цікавых спрау, чакаюць, што ты, узначаліш усе карысныя пачыны студэнтау. Ад цябе чакаюць парады і дапамогі. Можна назваць дзесяткі комсамольскіх актывістау універсітэта, якія з гонарам апраудваюць давер'е моладзі.

Але часта прыходзіцца сустракацца з такімі выпадкамі: быу студэнт добрым комсамольцам, акуратна выконвау даручэнні, удзельнічау у грамадскім жыцці калектыва—і выбралі яго сябры важаком. Праходзіць некаторы час—таварыша нельга пазнаць.

Памятаецца мне першы комсамольскі сход курса у мінулым годзе. Нам, першакурснікам, яшчэ мала знаёмым паміж сабой, трэба было выбраць групорга, які-б змог цікава павесці работу, стварыць моцны калектыу і якога паважау-бы кожны комсамолец... І здавалася, мы знайшлі сярод нас такога. Працавалі тады у калгасе. Вадзім Цішкевіч звярнуў на сябе увагу аднакурснікау сваёй працавітасцю і патрабавальнасцю да таварышау.

— Вось хто зможа заваяваць павагу калектыву, разгарнуць цікавую работу, — рашылі усе.

Але мы памыліліся... Як групорг Вадзім не заваяваў павагі комсамольцау курса. Ён заставаўся добрым комсамольцам, але яму многа чаго не хапала, каб стаць яшчэ добрым важаком. І каб даць вычарпальны адказ на пытанне, якім-жа павінен быць комсамольскі актывіст, карысна было-б прысутнічаць на комсамольскім сходзе нашага курса ў гэтым годзе. Аднакурснікі горача гаварылі аб тым, чаго яны чакалі ад Вадзіма і як не здзейснілися іх надзеі. Магчыма, што на першым курсе работа групорга больш цяжкая, чым на старэйшых курсах. Перад табой 50 чалавек, якія прышлі з розных школ. Кожны мае свае індывідуальныя асаблівасці. А трэба стварыць дружны калектыу студэнтау, спаяць іх у комсамольскую сям'ю. Справа цяжкая. Але тут і павінен выявіцца арганізацыйны талент важака, які змог бы павесці работу так, каб яна зацікавіла усіх. Магчыма, што не кожны студэнт уключыцца адразу ў справы калектыву, не адразу, магчыма, створыцца і сам калектыў. Але выбранае комсамольскае бюро павінна быць ядром, вакол якога і вырасце згуртаваная комсамольская сям'я.

— Комсамольскі важак павінен карыстацца павагай у таварышау, каб да яго звярталіся не толькі, каб заплаціць членскія узносы,але пагаварыць з ім, атрымаць сяброўскую параду і ў асабістай справе звярнуцца за дапамогай і атрымаць яе,—гаварыла на сходзе Тамара Карцава.

— Трэба быць прынцыповым. Нельга, баючыся сапсаваць адносіны з таварышам, пакрываць яго дрэнныя паводзіны і учынкі, — адзначау В. Зуёнак.

Павагай таварышау на курсе карыстаецца Тамара Карцава. Гэта добры, чулы сябра. З кожным яна можа пагаварыць, параіць, дапамагчы. Тамара і добры арганізатар. Кожны з нас памятае, з якім натхненнем узялася яна за справу, калі яе выбралі ў бюро курса. Памятаюць студэнты курса і праведзеныя вечары, культпаходы, экскурсіі. Не дарма ў гэтым годзе Тамару выбралі у комсамольскае бюро аддзялення.

Кіраўнік моладзі заўсёды павінен быць з калектывам, быць патрабавальным і да сябе і да таварышау. Ён павінен стаць сапраўдным важаком, здзейсніць надзеі комсамольцау, сваіх таварышау, якія аказалі яму вялікае давер'е.

Э. ЛУКАНСКАЯ,
студ. II к. аддз. журналістыкі.

КОМСАМОЛЬСКІ ВАЖАК

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

„Добрыя дзядзі"

Прыехаушы з практыкі, я звярнууся да былога каменданта інтэрната т. Бекішава з просьбай выдаць мне пасцельныя рэчы. Той, доуга не думаючы, прапанаваў мне спачатку распісацца, а затым паследваў адказ:

— Навалачку атрымаеце, а прасціны пасля. Не бойцеся, я-ж «добры дзядзя»,—прамармытау ён, хітравата усміхаючыся.

Калі я прышоу праз некалькі дзён за прасцінамі, тав. Бекішаў адразу-ж накіраваў мяне да т. Мурашкі.

— Скажыце, што я загадау даць вам прасціны.

Выслухаушы мяне, тав. Мурашка выдаў мне дзве прасціны, але узяў з мяне распіску.

На развітанне т. Мурашка сказаў мне:

— Не хвалюйцеся, мы з камендантам уладзім усё астатняе самі.

Нядауна мяне выклікалі ў бухгалтэрыю, дзе заявілі, што я павінен заплаціць за дзве прасціны, бо я іх атрымаў.

Тады мне стала зразумела, як уладзілі маю справу «добрыя дзядзі».

Хто-ж павінен разабрацца ў гэтай справе?

Н. ГЛУШАКОЎ.

НЕКАЛЬКІ СЛОЎ АБ ЧЫТАЛЬНАЙ ЗАЛЕ

Вельмі многія студэнты карыстаюцца нашай універсітэцкай чытальняй. Там заусёды можна дастаць патрэбную літаратуру, каб падрыхтавацца да заліка, экзамена. Але чытальная зала невялікая, і не заусёды змяшчае у сабе усіх жадаючых.

Вось што больш за усё абураюча. Ва універсітэце нямала «прадпрыймальных» і «дальнабачных» студэнтау. Яны прыходзяць загадзя у чытальную залу, кладуць на свабоднае месца сшытак і... месца занятае! Ляжыць гэты сшытак часта чатыры і больш гадзіны. А жадаючыя па-сапраўднаму займацца ходзяць паміж радоу і пытаюцца, ці занятае гэта месца, ствараючы шум і перашкаджаючы займацца іншым таварышам.

Зараз, калі пачалася экзаменацыйная сесія, дарагая кожная мінута. Такія эгаістычныя адносіны з боку некаторых студэнтау нецярпімы.

Д. ЛАПАЦІК,
студэнтка I курса хімфака.

НАШ КАЛЯНДАР

КАРСКІ Е. Ф.

(ДА 95-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

1 студзеня 1956 года споунілася 95 год з дня нараджэння выдатнага рускага вучонага, аўтара шматлікіх работ у галіне славянскага мовазнаўства, літаратуры, этнаграфіі і палеаграфіі, правадзейнага члена Акадэміі навук СССР і чэшскай Акадэміі навук, акадэміка Ефіма Фёдаравіча Карскага.

Е. Ф. Карскі нарадзіуся у сям'і настаўніка вёскі Лаша Гродзенскай губерні. Дзіцячыя гады будучага вучонага працякалі у ваколіцы Ятра Новагрудскага павета Мінскай губерні, куды пераехала сям'я Е. Ф. Карскага. Першапачатковае навучанне Е. Ф. Карскага працякала у Ятранскім народным вучылішчы.

Атрымаўшы сяроднюю адукацыю у Мінску, Е. Ф. Карскі у 1881 г. паступае у гісторыка-філалагічны інстытут у Нежыне Чэрнігаўскай губерні.

Падрыхтоўка Е. Ф. Карскага да навуковай дзейнасці пачалася яшчэ за студэнцкай партай. Знаходзячыся у цеснай сувязі з беларускім народам, Е. Ф. Карскі праяуляе асаблівую цікавасць да вуснай паэтычна-песеннай творчасці беларускага народа, мовы і літаратуры і марыць прысвяціць усё свае жыццё вывучэнню роднага краю і яго культуры.

Да гэтага часу адносіцца яго першая работа «Беларускія песні вёскі Бярозаўка Новагрудскага павета Мінскай губерні» (1883 г.). Нястомны збіральнік беларускага фальклору Е. Ф. Карскі пазней выпускае ў свет другі зборнік «Беларускія песні вёскі Новасёлак-Затрокскіх Віленскай губерні Трокскага уезду».

Пераехаўшы у г. Вільна, дзе ён працуе выкладчыкам мужчынскай гімназіі, Е. Ф. Карскі ўпорна займаецца вывучэннем мовы старажытных беларускіх помнікаў, знаёміцца з фальклорнымі зборнікамі П. Шэйна, П. Бессонава, І. Насовіча, М. Дзмітрыева, Н. Нікіфароўскага і інш.

З мэтай больш глыбокага азнаямлення з жывой гаворкай Е. Ф. Карскі асабіста робіць неаднаразовыя паездкі у розныя раёны Беларусі. Вынікам напружанай і крапатлівай працы з'явілася важнае па сваіх навуковых назіраннях даследаванне «Агляд гукаў і форм беларускай мовы». (1885 г.), у якім упершыню у гісторыі беларускага мовазнаўства даецца навуковае апісанне беларускай мовы, асаблівасцей яе фанетыкі, марфалогіі і сінтаксісу. У прадмове да гэтай работы Е. Ф. Карскі з поўным правам мог сказаць: «Што датычыцца навуковых даследаванняў (па беларускай мове.—**Рэд.**), то іх, можна сказаць яшчэ не існуе...»

У 1893 годзе Е. Ф. Карскі быў вызвален ад педагагічнай дзейнасці і прызначан лектарам рускай мовы пры Варшаўскім універсітэце.

Праз год Е. Ф. Карскі назначаецца экстраардынарным прафесарам Варшаўскага універсітэта па кафедры моў рускай і славянскай і гісторыі рускай літаратуры, а Совет Рускага Таварыства прысудзіў яму вялікі залаты медаль за навуковыя дасягненні па беларускай этнаграфіі.

У лістападзе 1896 года у Маскоўскім універсітэце Е. Ф. Карскі абараніў дысертацыю на тэму: «Заходне-рускія пераклады псалтыроў 15—16 стагоддзя» і атрымаў навуковую ступень доктара. За рэцэнзію на кнігу П. Шэйна «Матэрыялы» Акадэмія навук прысудзіла Е. Ф. Карскаму залаты медаль імя Бацюшкава.

Працы па беларусазнаўству займаюць галоўнае месца у навуковай спадчыне Е. Ф. Карскага. Да 1917 года дыялекталагічныя звесткі збіраліся па «Праграме для збірання асаблівасцей беларускіх гаворак», складзенай Е. Ф. Карскім у 1897 годзе.

Е. Ф. Карскаму належыць выключнае па свайму значэнню трохтомнае даследаванне—«Беларусы» (1903—1922 гг.)—вяршыня навуковай дзейнасці Е. Ф. Карскага. Прафесар В. К. Баркоўскі назваў «Беларусы» энцыклапедыяй жыцця беларускага народа. У гэтай рабоце Е. Ф. Карскі падрабязна апісвае не толькі беларускую мову ў яе гістарычным і сучасным становішчы, але і літаратуру, этнаграфію, гісторыю беларускага народа. Акадэмік Б. М. Ляпуноў зазначае, што у галіне вывучэння другіх славянскіх народаў цяжка знайсці працу, роўную «Беларусам» Е. Ф. Карскага.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі Е. Ф. Карскі працягвае працаваць у выбранай ім навуковай спецыяльнасці. З 1920 г. Е. Ф. Карскі рэдагуе «Звесткі аддзялення рускай мовы і славеснасці», друкуе артыкулы і манаграфіі, рэцэнзіі на кнігі, арганізоувае выданне помнікаў старажытнай пісьменнасці.

Выключна працаздольны і настойлівы, Е. Ф. Карскі дасканала валодаў усімі славянскімі мовамі, грэчаскай, лацінскай, санскрытам і інш. Яго пяру належыць больш 300 прац па пытаннях славянскага мовазнаўства і літаратуразнаўства, палеаграфіі і этнаграфіі.

Навуковая работа Е. Ф. Карскага не абмяжоувалася даследаваннем толькі беларускай мовы і літаратуры. Е. Ф. Карскі выступаў і як вучоны-гісторык рускай мовы і літаратуры, палеаграфіі і этнаграфіі.

Вялікі вучоны беларусавед Е. Ф. Карскі быў палымяным патрыётам сваёй любімай Радзімы.

Я. ВЕРАСАЎ.

ПЕРШАКУРСНІКІ Ў СЕКЦЫЯХ

У гэтым годзе фізкультурны калектыў універсітэта папоўніуся вялікім атрадам першакурснікаў. Многія з іх—значкісты ГПА I і II ступені, спартсмены-разрадніки. Сярод першакурснікаў—кандыдат у майстры па шашках М. Гелер (фізмат), першаразраднікі—акрабат Л. Ліушыц (хімфак) і шахматыст Чэсакоу (юрфак).

Першыя спартыуныя спаборніцтвы дапамаглі выявіць найбольш здольных спартсменаў, якія і былі уключаны у склад зборных каманд універсітэта і факультэтаў. Для жадаючых займацца пэуным відам спорту гасцінна расчынілся дзверы самых рознастайных секцый, арганізаваных пры кафедры фізічнага выхавання. Заняткі у секцыях праводзяць высококваліфікаваныя трэнеры. Выбраць студэнтам тую або іншую секцыю дапамаглі выкладчыкі, якія на першых-жа занятках правялі спаборніцтвы па бегу на 100 метрау, скачках, штурханню ядра і плаванню.

Вельмі радасна, што з усёй колькасці студэнтау, якія займаюцца у секцыях, каля палавіны—першакурснікі. Але у адны секцыи занісалася такая колькасць студэнтау, што выкладчыку давялося было правесці адборчыя спаборніцтвы, у іншыя-ж ішлі адзінкі. Больш за усё жадаючых займацца у лыжнай секцыі, у секцыях спартыунай і мастацкай гімнастыкі. А ў секцыю плавання, напрыклад, заняткі якой праходзяць у басейне інстытута фізкультуры, прышло толькі некалькі чалавек. Гэта, відаць, таму, што старшы трэнер т. Собалева вядзе работу толькі сярод разраднікау, прадастауляючы навічкам права плаваць «по воле волн».

Найбольш актыуна уключыліся ў работу секцый студэнты геафака, гістфака і інш. На юрфаку, аддзяленні журналістыкі, у секцыях займаюцца лічаныя студэнты. Віна ў гэтым у першую чаргу кладзецца на кіраунікоу кафедры фізічнага выхавання, якія не правялі належнай растлумачальнай работы і не змаглі уцягнуць студэнтау у секцыі. А ёсць, бясспрэчна, здольныя спартсмены і сярод першакурснікаў юрыдычнага факультэта і аддзялення журналістыкі.

Нядаўна закончыліся спаборніцтвы на першынство універсітэта па валейболу, у якіх мужчынская і жаночая каманды філалагічнага факультэта занялі апошнія месцы. У жаночай камандзе добрую тэхніку ігры паказала студэнтка першага курса аддзялення журналістыкі С. Анціпенка. Здавалася-б, чаму здольную студэнтку не прыцягнуць да сістэматычных заняткау у валейбольнай секцыі? Але адказны за ручныя ігры ад факультэцкага бюро ДСТ «Буравеснік» А. Пустаход і не думае што-небудзь прадпрыняць, каб накіраваць спартсменку у секцыю.

Добра паступіу калектыу лыжнаи секцыі і яе трэнер В. В. Нікіцін, які выключыу з секцыі прагульшчыкау студэнтау геафака Палешчукова і Лубейнікава. Закрыта секцыя навічкоу - баскетбалістау, што займаліся у першую змену з-за вялікага пропуску заняткау. Тым, хто парушае трэніровачны рэжым, прапускае заняткі, падрывае дысцыпліну у калектыве—не месца у секцыі! Так вырашылі студэнты-лыжнікі, так павінны зрабіць спартсмены усіх секцый.

О. СІНІЦКІ,
студэнт I курса
філалагічнага факультэта.

Гісторыя адкрыцця пральні

«З 14 лістапада 1955 года у падвале корпуса «Б» адкрыта пральня. У сувязі з гэтым катэгарычна забараняецца усякае мыццё бялізны ва умывальніках і на кухнях» —такая аб'ява паявілася каля месяца таму назад у інтэрнаце № 1 па Бабруйскай вуліцы. Унізе аб'явы даволі вялікімі літарамі было напісана: «Адміністрацыя».

Не паспела паявіцца гэтая «каштоуная папера», як усюды у корпусе, асабліва на першым паверсе, пачуліся радасныя воклічы:

— Нарэшце ёсць у нас пральня!

— Добрая справа, хоць і доуга чакалі мы гэтага свята!—дадау хтосьці басам.

— А мы гаворым, што аб нас не клапоцяцца. Патрэбна разумець: там таксама-ж студэнты!— урачыста зауважыу шырокаплечы хлапец, які толькі што уліуся у вясёлы натоўп і зразумеу у чым справа.

— Адкуль ты ведаеш?! Можа гэта сам прарэктар тав. Бярэзін паклапаціуся аб гэтым!—супярэчыу яму зусім малады юнак.

— Гэта не асноунае, хто паклапаціуся: прафком наогул ці яго старшыня тав. Марчанка з прарэктарам тав. Бярэзіным асабіста. Галоўнае у тым, што зроблена,—гаварылі другія.

У наступны дзень у корпусе «Б» паявіуся студэнт III курса Пільшчыкаў. У руках ён трымаў невялікі клуначак, які быў закручан у газету. Пільшчыкау прачытаў аб'яву, пастаяу некалькі хвілін, нібы ацэньваючы гэтую навіну, і пайшоу у падвал. Доуга «вандраваў» ён па падвалу, але пральні не удалося знайсці. «А можа гэта «пральня», — падумау Пільшчыкаў, уваходзячы у адзін з халодных пакояу, дзе стаяла некалькі брудных лавак, якія былі ссунуты у адзін кут. «Вандроунік» падышоу да крана і узяуся рукою: халодная; потым адкрыу яго—на падлогу палілася цёмнажоутая вада. «Мусіць, «асобага гатунку»,—зрабіу вывад Пільшчыкаў,—для мыцця асоба каштоуных рэчаў, а мая студэнцкая бялізна мабыць не вытрымае гэтага раствору».

— Чаго вы блукаеце?—звярнулася работніца тэхнічнага персаналу да Пільшчыкава, які у пахмурным настроі толькі што падняуся на першы паверх. У адказ студэнт махнуу рукой і паглядзеу на аб'яву.

— А-а! Вы шукалі пральню?— здагадалася жанчына — Ніякай пральні тут няма, гэта проста месца для мыцця. Ды і тазоу няма. Іх, прауда, было тры, але у той-жа дзень яны і зніклі, як і паявілісь: кажуць, што іх дзяучаты забрали...

Праз два тыдні тая-ж самая аб'ява паявілася і у корпусе «А», прауда, на яе ужо мала хто звароčвау увагу. Толькі некаторыя з усмешкай жартавалі: «Выпадкова не хочаце «павандраваць» у падвале корпуса «Б»? І у адказ студэнты толькі адмоуна махалі галавой...

А ці не пара ужо на самай справе задумацца прафкому і прарэктару па гаспадарчай частцы тав. Бярэзіну аб адкрыцці сапрауднай пральні?

Н. БЕЛАУСАЎ.

КУН В. Н.

22 снежня 1955 года пасля цяжкай працяглай хваробы памёр прафесар кафедры гісторыі СССР Уладзімір Нікалаевіч Кун.

Кун Уладзімір Нікалаевіч нарадзіуся у 1886 годзе у горадзе Пецербургу.

У 1913 г. Кун В. Н., скончыушы гісторыка-філалагічны факультэт Пецербургскага універсітэта, застауся ва універсітэце для падрыхтоукі да прафесарскага звання. У 1916 годзе ён быу выбран прыват-дацэнтам Пецербургскага універсітэта.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Кун В. Н. працаваў прафесарам у радзе універсітэтау і педагагічных інстытутау. У 1918 г. Кун В. Н. выбран прафесарам Кастрамскога дзяржаунага універсітэта, а з 1920 г.—прафесарам Туркестанскага дзяржаунага універсітэта. З 1927 г. Кун В. Н. працаваў прафесарам Казанскага дзяржаунага універсітэта і Казанскага педінстытута, а з 1938 г.—прафесарам Сярэднеазіяцкага дзяржаунага універсітэта і Ташкенцкага педагагічнага інстытута.

З 1949 г. В. Н. Кун працаваў прафесарам кафедры гісторыі СССР у Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Усё сваё жыццё В. Н. Кун аддаў справе падрыхтоукі высококваліфікаваных спецыялістау для нашай краіны. Лекцыі праф. В. Н. Куна па курсу гісторыі СССР карысталіся вялікім поспехам сярод студэнтау.

Прафесар В. Н. Кун праводзіу вялікую навукова-даследчую работу. Ён апублікаваў рад навуковых работ па гісторыі узаемаадносін старажытнай Русі з качэунікамі у X—XII вяках, аказваў вялікую дапамогу студэнтам, якія займаліся навукова-даследчай работай.

Калектыу універсітэта страціу аднаго з найбольш кваліфікаваных выкладчыкаў, скромнага і чулага таварыша.

Памяць аб В. Н. Куне будзе вечна жыць у нашых сэрцах.

Група таварышаў.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«СТВАРЫЦЕ НАРМАЛЬНЫЯ ЎМОВЫ»

Заметка пад такім загалоукам была змешчана у 29 нумары нашай газеты. У ей гаварылася аб неспрыяльных умовах работы у лінатыпным цэху. Дырэктар выдавецтва т. Кручкоу паведаміу, што па просьбе выдавецтва Галоуснаб Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР выдзеліу выдавецтву 10 аконных вентылятараў, якія паступяць у ближэйшы час і будуць устаноулены у цэхах.

Прарэктар універсітэта тав. Бярэзін даў указанне тав. Гапонаву паставіць вентыль-засоуку, якая дазволіць рэгуляваць тэмпературу паветра у памяшканні выдавецтва.

«СЯРОД БЕЛАГА ДНЯ»

У фельетоне, змешчаным пад такім загалоукам у 26 нумары нашай газеты, крытыкаваліся паводзіны студэнта Л. Стасевіча.

Начальнік навучальнай часткі універсітэта тав. Майракаў паведаміў рэдакцыі, што Л. Стасевіч выключан з універсітэта.

«ЯШЧЭ РАЗ АБ ПРАГУЛАХ»

Артыкул пад такім загалоукам быў змешчан у нашай газеце № 27. Дэкан гістарычнага факультэта тав. Савачкін паведаміў рэдакцыі, што гэты артыкул абмяркоуваўся на комсамольскім сходзе I курса і партыйным бюро факультэта. Студэнт I курса гістфака т. Трус, аб якім гаварылася у артыкуле, быў падвергнут рэзкай крытыцы. Тав. Трус улічыў крытычныя заувагі і паводзіны выправіў.

«ПА СЛЯДАХ МІНУЛАГОДНЯЙ КРЫТЫКІ»

Пад такім загалоукам у № 28 нашай газеты была змешчана крытычная заметка, у якой гаварылася аб тым, што у кубавай інтэрната па вуліцы Свердлова няма кіпятку.

Рэдакцыя атрымала пісьмо, у якім член прафкома т. Кавальчук, старшыня студкома т. Гадун, камендант інтэрната т. Ткачук паведамляюць аб тым, што кубаўшчыца З. Граковіч за дрэнную работу папярэджана. Прыняты усе меры для своечасовага забеспячэння студэнтау кіпятком.

МАЛАДЫ ГАСПАДАР ЖЫЦЦЯ

ЧЫТАЧЫ АБ КНІГАХ

Свой першы зборнік вершаў, выдадзены нядаўна Дзяржвыдавецтвам БССР, Сцяпан Гаурусёў назвау «Паходныя кастры». І зусім правільна, бо лірычны герой многіх вершаў паэта, наш сучаснік, «малады гаспадар свету»,—заусёды у паходзе, у дарозе да светлай будучыні, у «разведцы наступных дзён».

Яму, гэтаму герою, арганічна не уласціва заспакоенасць, ён не шукае лёгкіх шляхоу і дарог, ён, «між марай і жыццём праклаушы мост»,

Адным ахоплены імкненнем,
Каб асвятліць кастрамі шлях
Наступным,
Новым пакаленням.

Вобраз маладога совецкага чалавека праходзіць праз большасць вершау кнігі. Няхай гэта будзе садоунік ці шкляр, будаунік ці ваеннаслужачы,— паэт, глыбока пранікаючы ва унутраны свет герояу, перш за ўсё раскрывае перад чытачом харство чалавечай душы. І паказальна, што аутар не ставіць сабе задачу паказаць сваіх герояу у выключных абставінах, ён падае нам «будзённыя» малюнкі шматграннага нашага жыцця, гаворыць аб людзях простых прафесій, якія сумленна працуюць на карысць Радзімы.

Тым не менш, чытач бачыць і адчувае за кожнымі ўчынкамі совецкіх людзей іх вялікія, важныя справы.

Вось верш «Шкляр». Гэта, бадай, адзін з лепшых твораў зборніка. Герой яго адчувае сябе стваральнікам мірнага жыцця, і таму ён, як-бы выражаючы думкі і пачуцці усіх совецкіх людзей, проста і пранікнёна гаворыць:

Я грому не хачу, што усю
зямлю трасе
І шыбы нашы трушчыць на
асколкі.

Ён не жадае бачыць жахі новай вайны, ён—чалавек міру, і таму нам, совецкім людзям, зусім зразумела радасць шкляра—радасць свабоднай працы, калі ён з гордасцю кажа:

І весела смяецца дзетвара
З усіх вакон, рукой маёй
зашклёных.

Гэтая ўдала знойдзеная С. Гаурусёвым паэтычная дэталь добра адпавядае усяму стрымлена усхваляванаму і у той-жа час светламу, цёпламу настрою верша і робіць вобраз шкляра яшчэ больш прывабным сваёй унутранай прыгожасцю.

Рамантычнасць працоуных будняў паэт перадае у розных па зместу вершах: «Геолаг», «Чырвоны абоз», «Волгадонец», «На калгаснай сенажаці» і інш. І зноу на першы план выступаюць простыя совецкія людзі, і тое, чым жывуць яны, данесена паэтам ярка і сцісла:

Хай усё,
Што зробім мы,
Стане радасцю людскою!
(«Сады»).

І сапраўды, якая радасць—ствараць людское шчасце! І таму з вялікай цеплынёй успрыймаюцца шматлікія стваральнікі шчасця, такія, як дзяучына-шафёр («Па родных дарогах»), настаўнік («Маладосць»), волгадонец з аднайменнага верша.

Радуе, што ўсе яны—актыўныя будаўнікі комуністычнага грамадства. Так, юнак-волгадонец пасля заканчэння будаўніцтва канала зноу ідзе на пярэдні край барацьбы за шчасце і будучыню.

Ён пойдзе зноу, і імя
волгадонца
Пачуем мы на новых берагах.
Перад вачмі яго—шырокі
шлях,
А у глыбіні іх—заутрашняе
сонца.

Характэрна, што С. Гаурусёў паказвае свайго героя палкім, самаадданым патрыётам Радзімы. Сыноунюю любоў совецкага чалавека да родных мясцін, да бацькаўшчыны ён тонка перадае у вершы «Вясёлка у гарах».

І я хацеў узняцца
над гарамі,
Высокаю вясёлкаю заззяць.
Усю зямлю юнацкімі рукамі
Пяшчотна, па-сыноуняму
абняць.

Прауда, выказаная думка не новая, але яна падкупае чытача сапраўдным пачуццём і паэтычнасцю.

Хаця у С. Гаурусёва ёсць асобныя удалыя вершы, радкі, першая кніга яго не пазбаулена буйных недахопау.

Вельмі часта вершам маладога аутара не хапае сапраўднай вобразнасці, таго, што называецца паэтычнай мовай. Замест свежага, свайго вобраза, смелага параунання — сухія празаічныя апісанні, пералічэнні, з якімі сустракаешся на працягу усяго зборніка даволі часта. Вось, да прыкладу, верш «Атэстат сталасці». Тэма верша — заканчэнне юнаком дзесяцігодкі—і не новая, але удзячная. Здавалася-б, якую гармонію пачуццяў і думак можна было-б перадаць праз вобраз юнака, перад якім адкрываецца светлы шлях у жыццё!.. Тут і рамантыка, і мара аб подзвігу, і вера у цудоуную будучыню...

Паэт-жа гаворыць аб гэтым зусім без пачуцця:

Развітаўся сёння я са
школай,
Здаў экзамен за апошні клас.
І з сям'ёю школьнаю
вясёлай
Я расстаўся сёння першы
раз.

Гэтыя радкі не толькі не могуць эмацыянальна уздзейнічаць на чытача, наадварот, яны расхалоджваюць яго.

Не адзначаюцца свежасцю думкі вершы «Па родных дарогах», «Вецер». У радках вершау «Набрацімы», «Бацькаушчыне» праскальзвае агульшчына.

Некаторую аднастайнасць паэзіі С. Гаўрусёва стварае тое, што аутар амаль кожны верш пачынае з пейзажнага малюнка, прычым малюнак гэты пераходзіць з аднаго верша у другі. Так, «Ночы на граніцы», «Геолаг» пачынаюцца ударамі грому, а «Вясёлка у гарах», «Шчасце», «Атэстат сталасці»— малюнкам толькі што адшумеушай навальніцы.

У апошні час малады паэт значна знізіу патрабавальнасць да сябе— і гэта бачна па вершах, напісаных у гэтым годзе. Відаць, зусім выпадкова трапіу у зборнік верш «Памылка». Напісаны ў неуласцівым паэту сентыментальна мяшчанскім тоне, верш здзіуляе мастацкай безгустоунасцю і той лёгкасцю, з якой падыходзіць аутар да вырашэння тэмы кахання.

Трэба усё-ж адзначыць, што у сваім зборніку паэт дабіваецца найбольшага поспеху тады, калі, гаворачы аб простым чалавеку, раскрывае яго унутраны свет, паэтызуе яго працу.

І хочацца параіць Сцяпану Гаурусёву, каб ён і надалей працягваў у сваёй творчасці лінію паэтызацыі сціплага гераізма простых людзей у іх штодзённым змаганні за будучыню..

Эд. КАРПАЧОЎ,
студэнт I курса аддзялення журналістыкі.

Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 02 904 Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 13 Тыраж 2 000.